Міністэрства адукацыі  Рэспублікі Беларусь
Галоўнае упраўленне адукацыі Гродзенскага аблвыканкама
Упраўленне  адукацыі  Мастоўскага райвыканкама
дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Пескаўская сярэдняя школа Мастоўскага раёна”

# Праект “Субота ў  стылі рэтра”

Аўтары:
Вялічка Рэгіна Станіславаўна,
кіраўнік народнага
гісторыка-краязнаўчага музея
Рагацэвіч Тамара Раманаўна,
намеснік дырэктара
па асноўнай дзейнасці

Пескі
2023

Рэцэнзент:

Намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці дзяржаўнай установы адукацыі “Пескаўская сярэдняя школа Мастоўскага раёна” Г.Р.Гах

Складальнік:

Намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці дзяржаўнай установы адукацыі “Пескаўская сярэдняя школа Мастоўскага раёна” Т.Р.Рагацэвіч

Рэкамендована метадычным саветам дзяржаўнай установы адукацыі “Пескаўская сярэдняя школа Мастоўскага раёна”,«06»верасня 2023 года, пратакол № 2

**Субота ў стылі рэтра** /склад. Р.С.Вялічка, Т.Р. Рагацэвіч.- Пескі.Пескаўская сярэдняя школа Мастоўскага раёна: , 2023.- 30с.

У брашуры прадстаўлены праект арганізацыі шостага школьнага дня ў сельскай школе.

© Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Пескаўская сярэдняя школа
Мастоўскага раёна

## Змест


| | | |
|---|---|---|
| 1. | Актуальнасць праекта | 4 |
| 2. | Мэта і задачы праекта | 5 |
| 3. | Асноўная ідэя праекта | 5 |
| 4. | Удзельнікі праекта | 6 |
| 5. | Кіраўніцтва і кадры | 6 |
| 6. | Рэсурснае забеспячэнне праекта | 6 |
| 7. | Змест і механізм рэалізацыі | 7 |
| 8. | План рэалізацыі праекта | 9 |
| 9. | Крытэрыі рэзультатыўнасці праекта | 10 |
| 10. | Прагназуемыя вынікі | 11 |
| 11. | Перспектывы праекта | 12 |
| 12. | Спіс выкарыстаных крыніц | 13 |
| 13. | Дадатак 1. Мерапрыемствы школьнага народнага гісторыка-краязнаўчага музея | 14 |
| 14. | Дадатак 2. Музейны занятак “Кніга нараджаецца, каб жыць” | 16 |
| 15. | Дадатак 3. Музейны занятак “Незвычайны-звычайны прадмет” | 21 |
| 16. | Дадатак 4. “Пазнай свой край.” Экскурсійны квэст па аграгарадку Пескі | 25 |
| 17. | Дадатак 5. Інтэрактыўны занятак “Як хлеб прыйшоў на стол” | 29 |

## Актуальнасць праекта

Выхоўваць дзяцей на слаўных традыцыях свайго краю – адзін з прыярытэтных накірункаў шостага дня. Толькі з вяртаннем памяці мінулага можна пачаць пошук шляху ў будучыню. Без пачуцця малой радзімы няма і вялікага патрыятызму,таму выхаванне грамадзянскасці і патрыятызму пачынаецца з роднага парога, з тых месцаў, дзе ты нарадзіўся і вырас. У вопыце нашых бацькоў і дзядоў закладзена збожжа такой мудрасці, што і ў наш час яно прарасце і дасць добрыя ўсходы.

У цяперашні час вельмі важная роля надаецца школьным музеям па выхаванні ў падрастаючага пакалення духоўна-маральных каштоўнасцяў, пачуцця нацыянальнай прыналежнасці, любові і гонару за сваю Радзіму. Сёння як ніколі ясна, што без выхавання патрыятызму ў падрастаючага пакалення ні ў эканоміцы, ні ў культуры, ні ў адукацыі мы не зможам упэўнена рухацца наперад. З ранняга ўзросту чалавек пачынае ўсведамляць сябе часціцай сваёй сям'і, сваёй нацыі, сваёй Радзімы.Школьны музей уносіць дастойную лепту ў выхаванне патрыятызму навучэнцаў і дапамагае выхаваць у навучэнцаў пачуццё годнасці і гонару, адказнасці і надзеі, раскрывае сапраўдныя каштоўнасці сям'і, нацыі і Радзімы.Стыль рэтра з’яўляецца спосабам пераканання, што мінулае мае сваю каштоўнасць і можа даць новы імпульс для развіцця сучаснай культуры і мастацтва.

Дзейнасць школьнага гісторыка-краязнаўчага музея па ажыццяўленні стыля рэтра дазваляе падрастаючаму пакаленню асэнсаваць значнасць важных жыццёвых каштоўнасцяў: памяць і абавязак, духоўнасць і маральнасць, патрэбнасць быць карысным у сваім калектыве, такім чынам, быць годным грамадзянінам сваёй Радзімы. Такім чынам асноўная задача школьнага музея-захаваннегістарычнайспадчыныроднага краю. Дзіця, падлетак, які будзе ведаць гісторыю свайго сяла, горада, побыту сваіх продкаў, помнікаў архітэктуры, ніколі не зробіць акту вандалізму ні ў дачыненні да гэтага аб'екта, ні ў дачыненні да іншых. Ён проста будзе ведаць ім цану.

Абвяшчэнне 2023 года Годам міру і стварэння стала добрай магчымасцю, каб абагульніць і пашырыць эфектыўныя практыкі педагагічнай дзейнасці ў гэтым напрамку.

Па выніках анкетавання ўстаноўлена, што 69% навучэнцаў праяўляюць зацікаўленасць да мерапрыемстваў шостага школьнага дня, актыўнасць, астатнія 31% цікавяцца час ад часу.

На аснове існуючых праблем педагогамі ўстановы адукацыі быў распрацаваны праект шостага школьнага дня “Субота ў стылі рэтра” ,дзе прадугледжваецца актыўная дзейнасць навучэнцаў на факультатыўных занятках“Асновы праваслаўнай культуры”,выхаваўчых мерапрыемствах на базе школьнага народнага гісторыка-краязнаўчага музея,грамадскіх аб’яднанняў БРПА,БРСМ, моладзевага парламента,бацькоўскага клуба “Лабірынт”,аб’яднанняў па інтарэсах “Палітра рухаў” і “Мазаіка творчасці”

Праект прадстаўляе арганізатарам выхаваўчага працэсу вялікую свабоду творчасці. Ён складзены з улікам арыенціраў,вызначаных Канцэпцыяй і Праграмай непарыўнага выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь , школьнай праграмы выхавання , мерапрыемстваў да Годаміру і стварэння, згодна календару знамянальных і памятных дат.

Асаблівая ўвага надаецца прыцягненню да ўдзелу ў рабоце аб’яднанняў па інтарэсах у шосты школьны дзень навучэнцаў з неблаганадзейных сем’яў. Актывізуецца супрацоўніцтва з сацыяльнымі органамі, Пескаўскай праваслаўнай царквой, установамі культуры, спонсарамі.

Такім чынам, праект мае важнае значэнне для вырашэння шэрагу выхаваўчых і сацыяльных праблем у масштабе ўстановы адукацыі: правядзенне запланаваных мерапрыемстваў шостага школьнага дня на базе школьнага народнага гісторыка-краязнаўчага музея,стварэнне мадэлі ўзаемадзеяння школы і соцыума, бацькоў, прапаганда добрасумленных адносінаў да працы, выкарыстанне разнастайных інтэрактыўных форм і метадаў работы з навучэнцамі.

**Мэта**: выхаванне ў навучэнцаў вернасці беларускім духоўным традыцыям, адказнасці, прававой свядомасці, павазе да каштоўнасцей беларускай нацыянальнай культуры, далучэнне да сённяшняга дня Беларусі праз арганізацыю дзейнасці народнага гісторыка-краязнаўчага музея.

**Задачы:**

1) арганізаваць правядзенне пазнавальнай і даследчай дзейнасці навучэнцаў па вывучэнні культуры продкаў, традыцый і звычаяў, лёсаў людзей старэйшага пакалення для ўмацавання духоўных сувязяў паміж пакаленнямі праз дыялог і сумесную дзейнасць;

2) актывізаваць удзел дзяцей і падлеткаў у традыцыйных і сямейных мерапрыемствах;

3) папоўніць музейныя калекцыі экспанатамі, стварыць экспазіцыю ў школьным народным гісторыка-краязнаўчым музеі “Славутыя землякі майго краю”, напісаць гісторыю “Пескі пасляваенныя”;

4) пашыраць супрацоўніцтва установы адукацыі з соцыумам;

5) садзейнічаць прыцягненню максімальнай колькасці навучэнцаў і бацькоў да актыўных форм адпачынку праз арганізацыю экскурсійнай дзейнасці.

## Асноўная ідэя праекта

У кожную першую суботу месяца на базе школьнага народнага гісторыка-краязнаўчага музея арганізуюцца мерапрыемствы па рэалізацыі музейнага праекта “Субота ў стылі рэтра” для навучэнцаў кожнай ступені навучання :“Кніга нараджаецца, каб жыць” (верасень), “Стол беларуса пустым не бывае” (кастрычнік), “Чалавечая памяць межаў не мае” (лістапад), “Новы год у стылі рэтра” (снежань), “Ты любіш народ свой і край? Песні яго спявай!” (студзень), “Ад зярняці да каравая” (люты), “Знаходка -2024”

(сакавік), “Над Зяльвянкаю мой жыццядайны куток” (красавік), “Мой род – мая гісторыя” (май).

**Тэрміны рэалізацыі:** праект разлічаны на верасень 2023- май 2024 года

**Удзельнікі праекта:** навучэнцы 1-11 класаў, іх законныя прадстаўнікі, педагогі, кіраўнік музея, кіраўнікі аб’яднанняў па інтарэсах;

**Мэтавая група**: навучэнцы 1-11 класаў, якія маюць недастатковыя веды і ўменні аб гісторыі, культуры і традыцыях нашых продкаў.

**Кіраўніцтва і кадры**

Кіраўніцтва праекта ажыццяўляе метадычны савет школы.

Дырэктар школы вызначае змест і асноўныя накірункі выхаваўчай работы, стварае неабходныя ўмовы для творчасці педагогаў, падтрымлівае сувязі са спонсарамі.

Намеснікі дырэктара арганізуюць работу педагогаў, прыцягваюць да работы грамадскасць,законных прадстаўнікоў,бацькоў.

Педагог-арганізатар арганізуе, праводзіць агульнашкольныя мерапрыемствы, дапамагае педагогам, якія выконваюць функцыі класных кіраўнікоў.

Педагог сацыяльны дапамагае навучэнцам з дэвіянтнымі паводзінамі выбраць правільныя арыенціры,знайсці сябе.

Педагогі дадатковай адукацыі развіваюць творчыя здольнасці навучэнцаў, фарміруюць імкненне да здаровага ладу жыцця,ахопліваюць шырокае кола інтарэсаў.

Педагогі, якія выконваюць функцыі класных кіраўнікоў, арганізуюць разнастайную дзейнасць навучэнцаў у вольны час.

**Рэсурснае забеспячэнне праекта**

1. Матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне:

- матэрыяльна-тэхнічная база ўстановы адукацыі, сельскага цэнтра культуры і адпачынку “Струбніца”, сельскіх клубаў і бібліятэк “Пескі “ і “Зарудаўе, школьнага музея, школьнага бібліятэчнага цэнтра

-сучасныя тэхнічныя сродкі (камп’ютары,музычныя цэнтры)

2. Інфармацыйна-метадычнае забеспячэнне:

- распрацоўка метадычных рэкамендацый, сцэнарыяў

-арганізацыя тэматычных выстаў

-вучоба прадстаўнікоў грамадскасці

- супрацоўніцтва з прадстаўнікамі органаў правапарадку,турыстычнымі агенствамі, выдавецтвамі і СМІ

3.Тэхналагічнае:

-укараненне ў выхаваўчы працэс інавацыйных тэхналогій

4. Кадравае:

-арганізацыя дзейнасці па павышэнню прафесійнага майстэрства педагогаў і грамадскасці, зацікаўленых асоб

-правядзенне майстар-класаў спецыялістамі-прафесіяналам

## Змест і механізм рэалізацыі

**1.“Кніга нараджаецца, каб жыць”(верасень)**

**Мэта:** Садзейнічаць пашырэнню ведаў навучэнцаў аб краіне,яе гісторыі, фарміраванню дачынення да сённяшняга дня Беларусі,выхаванню любові да сваёй малой радзімы

**Мерапрыемствы:**

1.Музейны ўрок “Нам дарогу ў свет адкрывае буквар”

2.Музейны квэст “Тут мінулае з сучаснасцю сышліся”

3.Гістарычны экскурс “Гісторыю школы пішам разам”

**2. “Стол беларуса пустым не бывае” (кастрычнік)**

**Мэта**: зацікавіць гісторыяй свайго народа, фарміраваць пачуццё дачынення да значных падзей мінулага.

**Мерапрыемствы:**

1.Агульнашкольнае свята народных страў з бульбы “Бульбяны фэст”

**3. “Чалавечая памяць межаў не мае”(лістапад)**

**Мэта**:развіваць пачуццё дачынення да значных падзей мінулага, пачуццё абавязку і адказнасці за сваю Айчыну

Мерапрыемствы:

1. Каляндарна-абрадавае свята “Дзяды, дзяды, прыходзьце сюды”
2. Цімураўская акцыя “Імён забытых не бывае”
3. Валанцёрская акцыя “Каб памяць жыла”

**4. “Новы год у стылі рэтра” (снежань)**

**Мэта:** зацікавіць навучэнцаў гісторыяй свайго народа, фарміраваць пачуццё дачынення да значных падзей мінулага.

Мерапрыемствы:

1. Прэзентацыя выставы “Рэтраёлка і рэтрацацка”
2. Творчая майстэрня “Віншавальная паштоўка”
3. Дыялогавая пляцоўка “Калядныя традыцыі праваслаўных і каталікоў”

**5. “Ты любіш народ свой і край? Песні яго спявай!” (студзень)**

**Мэта:**фарміраваць у навучэнцаў веды аб матэрыяльных і духоўных адметнасцях роднага краю, выхоўваць цікавасць і павагу да гісторыі, традыцый свайго роднага краю, нацыянальных і культурных традыцый беларускага народа

**Мерапрыемствы:**

1.Агульнашкольнае свята народных песен і танцаў

**6.“Ад зярняці да каравая” (люты)**

**Мэта:** садзейнічаць выхаванню гарманічна развітай асобы з пачуццём патрыятычнай і грамадзянскай самасвядомасці, стымуляваць моладзь да творчай дзейнасці

**Мерапрыемствы:**
1.Інтэрактыўны занятак “Як хлеб прыйшоў на стол”
2.Экскурсія ў КСУП імя А.Міцкевіча “Кормяць нас не чарадзеі”
3.Дыялогавая пляцоўка “Хлебароб – прафесія годная”

**7. “Знаходка -2024” (сакавік)**

**Мэта:** выхоўваць пачуццё любові да Радзімы, паважлівых адносін да нацыянальных традыцый і культуры Беларусі, прабуджэнне пачуцця годнасці за свой народ у дзяцей і падлеткаў

**Мерапрыемствы:**
1.Музейны квэст “Мы шукаем экспанат”
2.Музейны ўрок “Незвычайны-звычайны прадмет”
3.Творчая сустрэча “З гісторыі аднаго экспаната”

**8. “Над Зяльвянкаю мой жыццядайны куток”(красавік)**

**Мэта:** выхоўваць у навучэнцаў нацыянальную самаідэнтычнасць і гонар за свой род, сваіх землякоў

**Мерапрыемствы:**
1.Экскурсія “Мой родны кут”
2.Фотаальманах “Сведкі сівой мінуўшчыны”
3.Відэаальбом Сведкі сівой мінуўшчыны”

**9.“Мой род – мая гісторыя” (май)**

**Мэта:** выхоўваць у навучэнцаў нацыянальную самаідэнтычнасць і гонар за свой род, сваіх землякоў

**Мерапрыемствы:**
1.Выстава “Сямейная рэліквія”
2.Конкурс радаводаў

**10. Падвядзенне вынікаў удзелу ў праекце.**

## Асноўныя накірункі выхаваўчай работы народнага гісторыка-краязнаўчага музея ў шосты школьны дзень

- Пошукава-даследчая і навуковая работа
- Асветніцкая дзейнасць (экскурсіі,мерапрыемствы)
- Экспазіцыйная дзейнасць

## Этапы рэалізацыі праекта

**1 этап** – арганізацыйны (верасень-кастрычнік 2023 года)
**2 этап** – асноўны (лістапад 2023 –красавік 2024года)
**3 этап** – дыягнастычны (май 2024 года)
**4 этап** – рэфлексіўна – ацэначны (чэрвень 2024года

**План рэалізацыі праекта**

| Дзеянні | Тэрміны | Адказныя |
|---|---|---|
| **I этап. Арганізацыйны** | | |
| Кірмаш ідэй і прапаноў па зместу праекта, выпрацоўцы тактыкі і стратэгіі яго рэалізацыі. | верасень-кастрычнік 2023 | адміністрацыя |
| Падрыхтоўка ўдзельнікаў праекта, стварэнне ўмоў для рэалізацыі праекта | верасень-кастрычнік 2023 | адміністрацыя |
| **II этап. Асноўны** | | |
| Дакументальнае афармленне праекта | кастрычнік-май 2024 | адміністрацыя |
| Кансультацыі для настаўнікаў | кастрычнік-май 2024 | адміністрацыя |
| Кніжныя выставы (агляд літаратуры). | верасень-май 2024 | бібліятэкар |
| Абнаўленне інфармацыі на стэндзе | пастаянна | педагог-арганізатар |
| Правядзенне мерапрыемстваў згодна з планам мерапрыемстваў у шосты школьны дзень (*Дадатак 1*) | верасень-май 2024 | намеснік дырэктара па ВР,класныя кіраўнікі, сацыяльны педагог, педагог- арганізатар, педагог-псіхолаг,педагогі |
| Арганізацыя работы аб'яднанняў па інтарэсах. | | адміністрацыя |
| Фарміраванне банка сцэнарыяў і метадычных распрацовак па арганізацыі і правядзенні мерапрыемстваў у шосты школьны дзень. | на ўвесь перыяд | намеснік дырэктара па ВР,класныя кіраўнікі, педагог-арганізатар |
| Выданне нататкаў у перыядычным друку і агульнашкольнай газеце. Размяшчэнне інфармацыі па рэалізацыі праекта на школьным сайце. | верасень-май 2024 | намеснік дырэктара па ВР,класныя кіраўнікі, педагог-арганізатар |
| Вядзенне маніторынга "Занятасці навучэнцаў у шосты школьны дзень". | верасень-май 2024 | намеснік дырэктара па ВР,класныя кіраўнікі, педагог-арганізатар |
| **III этап. Дыягнастычны** | | |
| Вядзенне маніторынга "Занятасць вучняў у шосты школьны дзень". | верасень-май | намеснік дырэктара па ВР,класныя кіраўнікі, сацыяльны педагог, |

| | | |
|---|---|---|
| | | педагог- арганізатар, педагог- псіхолаг |
| Анкетаванне, назіранне, аналіз. | верасень,май | наменнік дырэктара па ВР,класныя кіраўнікі, сацыяльны педагог, педагог- арганізатар, педагог- псіхолаг |
| Кірмаш ідэй і прапаноў па зместу праекта. | верасень,май | наменнік дырэктара па ВР,класныя кіраўнікі, сацыяльны педагог, педагог- арганізатар, педагог- псіхолаг |
| **IV этап. Рэфлексіўна – ацэначны** | | |
| Круглы стол « Поспехі і няўдачы праекта». | май 2024года | наменнік дырэктара па ВР,класныя кіраўнікі, сацыяльны педагог, педагог- арганізатар, педагог- псіхолаг |
| Папулярызацыя эфектыўнага правядзення мерапрыемстваў шостага школьнага дня ў перыядычным друку: газеты “Зара над Нёманам”, сайт ўстановы адукацыі | чэрвень 2024года | наменнік дырэктара па ВР,педагог- арганізатар |
| Выпуск тэматычнага нумару школьнай газеты | чэрвень 2024года | наменнік дырэктара па ВР,педагог- арганізатар |

**Крытэрыі рэзультатыўнасці праекта**

-запатрабаванасць праекта, зацікаўленасць сацыяльных партнёраў у яго рэалізацыі;
-маральны, патрыятычны характар рэалізаваных ініцыятыў;
-сфарміраванасць у ўдзельнікаў праекта беражлівых адносінаў да акружаючага свету, грамадзянска-патрыятычных якасцей (гонар за сваю Айчыну, павага да старэйшых, паважаных людзей,талерантнасць,патрыятызм,грамадзянскасць);
- здольнасць супрацьстаяць негатыўным тэндэнцыям;
- сфарміраванасць асноў нацыянальнай самасвядомасці, устойлівасці поглядаў, здольнасці да самаразвіцця;
- эфектыўная занятасць дзяцей у шосты школьны дзень тыдня.

Крытэрыі і паказчыкі выніковасці праекта

| Крытэрыі | Паказчыкі | | |
|---|---|---|---|
| | Пачатак | Заключны этап | Агульны вывад |
| Цікавасць да ўдзелу ў праекце | | | |
| Узровень ведаў | | | |
| Задаволенасць | | | |
| Колькасць новых экспанатаў | | | |
| Колькасць удзельнікаў | | | |
| Актыўнасць удзелу ў праекце | | | |

## Прагназуемые вынікі

Рэалізацыя мерапрыемстваў, прадугледжаных Праектам, стане важным інструментам захавання і развіцця культурнай спадчыны, традыцый роднага краю.

Вынік дадзенага праекта – станаўленне народнага гісторыка-краяхзнаўчага музея як цэнтра маральных, духоўных, культурных зносін, цэнтра адраджэння нацыянальнай культуры і традыцый роднага краю.

Вынік Праекта прадугледжвае:

-Павышэнне іміджу народнага гісторыка-краяхзнаўчага музея;

-Стварэнне фонду мультымедыйных прадуктаў;

-Падрыхтоўка цыклаў публікацый у перыядычнымдруку па выніках рэалізацыі праекта

-Павышэнне творчай актыўнасці і педагагічнага майстэрства педагогаў, выхавальнікаў

-Абнаўленне ўтрымання, аптымізацыя формаў і метадаў арганізацыі выхаваўчага працэсу ў шосты школьны дзень з улікам навейшых дасягненняў у вобласці выхавання

-Дзейснае ўзаемадзеянне з сям'ёй праз арганізацыю сумеснага з дзецьмі вольнага часу, накіраванага на павышэнне прэстыжу сям'і і сямейнага выхавання, прафілактыку сямейнай неблаганадзейнасці

-Устойлівае паніжэнне ўзроўня падлеткавай злачыннасці ў выніку 100% прыцягнення навучэнцаў у дзейнасць шостага школьнага дня

-Умацаванне здароўя навучэнцаў, станаўленне іх грамадзянскай пазіцыі

-Стварэнне ўмоў для рэалізацыі здольнасцей і інтарэсаў падлеткаў сацыяльна значымай сумеснай дзейнасці з аднагодкамі і дарослымі

-Максімальнае выкарыстанне сацыяльнага партнёрства, рэсурсаў установ пазашкольнай адукацыі і выхавання, культуры і спорту,аховы здароўя,службы занятасці,праваахоўных органаў,грамадскіх арганізацый і структу

## Перспектывы праекта

Пашырыць спектр паслуг дадатковай адукацыі праз прыцягненне большай колькасці педагогаў і прадстаўнікоў соцыума, развіццё тэхнічных магчымасцей

Практыкаваць мульціварыятную сістэму пры арганізацыі дзейнасці аб'яднанняў па інтарэсах

Актывізаваць турыстычную і краязнаўчую дзейнасць, шырэй выкарыстоўваць матэрыялы школьнага музея ў выхаваўчай рабоце шостага школьнага дня

## Спіс выкарыстаных крыніц

1.Арганізацыйна-змястоўнае напаўненне шостага дня вучэбнага тыдня ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі,функцыянуючых у сельскай мясцовасці:метадычныя рэкамендацыі // Пазашкольнае выхаванне. - 2003. - №4.

2.Інструктыўна-метадычнае пісьмо Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь «Аб асаблівасцях арганізацыі сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы ў 2023/2024 навучальным годзе» .

3. Канцэпцыя непарыўнага выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс] : пастанова Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь , 15.07.2015, № 823 // ЭТАЛОН. Заканадаўства Рэспублікі Беларусь / Нац. Цэнтр прававой інфарм. Рэспублікі Беларусь. – Мінск, 2022.

4. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі [Электроны рэсурс] : у рэдакцыі Закона Рэспублікі Беларусь, 14.01.2022 г. № 154-3 // ЭТАЛОН. Заканадаўства Рэспублікі Беларусь / Нац. Цэнтр прававой інфарм. Рэсп. Беларусь. – Мінск, 2022

5. Кедзярава Р.Н. Арганізацыя шостага дня школьнага тыдня: Метадычныя рэкамендацыі / Р.Н.Кедзярава, Т.В.Пташнік, Т.П.Шэрамет; Акадэмія последыпломнай адукацыі. Мн., 2004.

6. Праграманепарыўнага выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі Рэспублікі Беларусь на 2021-2025 гг. [Электронны ресурс] :пастанова Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь , 31.12.2020, № 312 // Национальный образовательный портал – Рэжым доступа : https://adu.by/images/2021/03/programa-vospitaniya-2021-2025.pdf. – Дата доступа : 06.06.2022

Дадатак 1

**Мерапрыемствы школьнага народнага гісторыка-краязнаўчага музея урамках рэалізацыі праекта "Субота ў стылі рэтра"**

| № п/п | Назва мерапрыемства | Дата правяд зення | Удзельнікі праекта | Адказныя | Месца правядзення |
|---|---|---|---|---|---|
| | **Верасень. "Кніга нараджаецца, каб жыць"** | | | | |
| 1. | Музейны ўрок "Нам дарогу ў свет адкрывае буквар" | 02.09. 2023 | Вучні пачатковых класаў | Кіраўнік музея | Школьны музей |
| 2. | Музейны квэст "Тут мінулае з сучаснасцю сышліся" | | Навучэнцы 5-8 класаў | Кіраўнік музея | Школьны музей |
| 3. | Гістарычны экскурс "Гісторыю школы пішам разам" | | Навучэнцы 9-11 класаў | | Кабінет інфарматыкі |
| | **Кастрычнік. "Стол беларуса пустым не бывае"** | | | | |
| 1. | Агульнашкольнае свята народных страў з бульбы "Бульбяны фэст" | 07.10. 2023 | Навучэнцы 1-11 класаў | | ІІ паверх |
| | **Лістапад. "Чалавечая памяць межаў не мае"** | | | | |
| 1. | Каляндарна-абрадавае свята "Дзяды, дзяды, прыходзьце сюды" | 04.11. 2023 | Навучэнцы пачатковых класаў | | Кабінет беларускай мовы |
| 2. | Цімураўская акцыя "Імён забытых не бывае" | | Навучэнцы 5-8 класаў | Педагог-арганізатар | Праваслаўныя могілкі |
| 3. | Валанцёрская акцыя "Каб памяць жыла" | | Навучэнцы 9-11 класаў | Класныя кіраўнікі | Помнікі аг.Пескі |
| | **Снежань. "Новы год у стылі рэтра"** | | | | |
| 1. | Прэзентацыя выставы | 02.12. 2023 | Навучэнцы пачатковых | | Школьная бібліятэка |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | “Рэтраёлка і рэтрацацка” | | класаў | | |
| 2. | Творчая майстэрня “Віншавальная паштоўка” | | Навучэнцы 5-8 класаў | | Кабінет беларускай мовы |
| 3. | Дыялогавая пляцоўка “Калядныя традыцыі праваслаўных і каталікоў” | | Навучэнцы 9 -11 класаў | | Школьны музей |
| | **Студзень. “Ты любіш народ свой і край? Песні яго спявай!”** | | | | |
| | Агульнашкольнае свята народных песен і танцаў | 13.01.2024 | Навцчэнцы 1-11 класаў | Педагог-арганізатар | Актавая зала |
| | **Люты. “Ад зярняці да каравая”** | | | | |
| 1. | Інтэрактыўны занятак “Як хлеб прыйшоў на стол” | 03.02.2024 | Навучэнцы пачатковых класаў | Кіраўнік музея | Школьны музей |
| 2. | Экскурсія ў КСУП імя А.Міцкевіча “Кормяць нас не чарадзеі” | | Навучэнцы 5-8 класаў | Класныя кіраўнікі | |
| 3. | Дыялогавая пляцоўка “Хлебароб – прафесія годная” | | Навучэнцы 9-11 класаў | Класныя кіраўнікі | Кабінет беларускай мовы |
| | **Сакавік. “Знаходка -2024”** | | | | |
| 1. | Музейны ўрок “Незвычайны-звычайны прадмет” | 02.03.2024 | Навучэнцы пачатковых класаў | Кіраўнік музея | Школьны музей |
| 2. | Музейны квэст “Мы шукаем экспанат” | | Навучэнцы 5-8 класаў | Кіраўнік музея | Школьны музей |
| 3. | Творчая сустрэча “З гісторыі аднаго экспаната” | | Навучэнцы 9-11 класаў | Кіраўнік музея | Школьны музей |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | **Красавік . “Над Зяльвянкаю мой жыццядайны куток”** | | | | |
| 1. | Экскурсія “Мой родны кут” | 06.04.2024 | Навучэнцы пачатковых класаў | Класныя кіраўнікі | Аг.Пескі |
| 2. | Фотаальманах “Сведкі сівой мінуўшчыны” | | Навучэнцы 5-8 класаў | Кіраўнік музея | Аг.Пескі |
| 3. | Відэаальбом Сведкі сівой мінуўшчыны” | | Навучэнцы 9-11 класаў | Педагог-арганізатар | Кабінет інфарматыкі |
| | **Май. “Мой род – мая гісторыя”** | | | | |
| 1. | Выстава “Сямейная рэліквія” | 04.05.2024 | Навучэнцы пачатковых класаў | Кіраўнік музея | Школьны музей |
| 2. | Конкурс радаводаў | | Навучэнцы 5-11 класаў | Класныя кіраўнікі | Школьная бібліятэка |
| | **Чэрвень. Падвядзенне вынікаў удзелу ў праекце. 02.06.2024** | | | | |

Дадатак 2

**Музейны занятак для вучняў 3-8 класаў**
**“Кніга нараджаецца, каб жыць”**

**Мэта**: знаёмства з гісторыяй стварэння і зменах, якія адбываліся з беларускім букваром на працягу 400 гадоў яго існавання;

**Задачы:**

- Пазнаёміць з гісторыяй выдання першых буквароў, са змяненнем яго назвы на працягу стагоддзяў;
- Правесці прэзентацыю выставы буквароў розных гадоў выдання, якая арганізавана ў школьным музеі;
- Прадэманстраваць відэаролік зняты ў музеі “Нам дарогу ў свет адкрывае буквар”

**Эпіграф:**

Бясследна нішто не міне,
Гісторыя слова адродзіць.
Ты – мост, па якім да мяне
Мінуўшчына ў госці прыходзіць.
Мільгаюць старонкі твае –
І мы размаўляем з вякамі,
І продак да нас дастае
Радкамі, нібыта рукамі. П.Макаль

**Ход занятка**

Вядучы: Добры дзень, мае сябры! Перш, чым пачаць нашу сустрэчу, я загадаю вам загадку:

“Я слову беларускаму служу,
вучу чытаць, пісаць, любіць радзіму,
я нарадзіўся тут, і тут жыву,
і беларускі край я не пакіну.”

Сягодня мы запрашаем вас у незвычайнае падарожжа, падарожжа даўжынёй у 400 год. Менавіта столькі часу прайшло з выдання на Беларусі першага буквара.

- Як вы думаеце, ці падобны ён быў на наш, сучасны буквар?

Вядома, не. Паглядзіце на яго старонкі. Ці маглі бы вы прачытаць, што тут напісана, ці хаця бы назваць літары, якія вы бачыце. Таксама, не.

"Буквар" не быўпершайкнігай для навучанняпісьму і чытанню. Такія "падручнікі" існавалі і раней — людзівучыліся па кнігахСкарыны, Фёдарава і Зізанія. Але вось выданняўпадназвай "Буквар" дагэтульсапраўды не было, таму 24 ліпеня 1618 года і лічыцца днём яго нараджэння. Ён сістэматызаваў увесь накоплены вопыт у навучанні грамаце і на той час быў самым дасканалым.




Так атрымалася, што радзімай першага "Буквара" стала не Вільня, а мястэчка Еўе Троцкага ваяводства прыблізна ў 40 кіламетрах ад сучаснай літоўскай сталіцы. Там знаходзіўся маёнтак Агінскага. Дарэчы, герб спонсара і цяпер можна ўбачыць на першай старонцы кнігі. Складана ўявіць, але, калі б не падтрымка беларускага магната Багдана Агінскага, гэтай кнігі магло б і не быць. Менавіта ён падтрымаў тагачасны цэнтр праваслаўнай культуры ВКЛ — Віленскі Свята-Духавы манастыр, дзе ў 1618 годзе пабачыў свет *“Букварь языка славенска писаний чтения обучитися хотящим в полезное руковожение”* на 52 лістах у кішэнным фармаце. У “Буквары” размешчаны славянскі алфавіт, прыклады складоў з двух і трох літар, простыя словы на царкоўна славянскай мове, пералік знакаў прыпынку, лічбаў (у кірылічнай традыцыі), а таксама асновы граматыкі і тэксты для чытання, сяродякіх – рэлігійныя гімны, малітвы, запаведзі, пропаведзі.

У свеце існуюць толькі два арыгіналы першага беларускага "Буквара". Адзін — няпоўны, але добра захаваны — у Каралеўскай бібліятэцы ў Капенгагене, другі — саамы лепшы — у бібліятэцы ў цэнтры Лондана.

У самае сэрца Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі беларускі "Буквар" трапіў дзякуючы чалавеку, які скупаў азбукі і буквары на розных экзатычных мовах для ўласнай калекцыі. Выданне дагэтуль захоўваецца ў цудоўным стане і выглядае амаль так, як і 400 гадоў таму. Англійскія калегі нават не падазравалі, якім скарбам валодаюць, бо першы беларускі "Буквар" ніхто з іх не мог прачытаць. На тытульным лісце арыгінала чарніламі было проста напісана "Кніга на славянскай мове".




Прычынатаго, што на нашых землях не захаваласяніводнагаарыгінала з першыхэкземпляраў, даволі простая — "Буквары" нашыпродкізачытвалі да дзірак.

"Фактычна, усе першыя выданні захаваліся ў адным, двух, рэдка трох экземплярах. І амаль усе янызнаходзяцца за мяжою, дзеіх не чыталі. Як кажуць, няшчасце дапамагло. Нам пашанцавала, што гэтыя кнігі выпадкова трапілі за мяжу".




Спіс выдадзеных на беларускіх землях букварах папоўнілі і іншыя выданні, сярод якіх “Буквар” Спірыдона Собаля, “Буквар” Сімяона Полацкага”

Вучоныя сцвярджаюць, што з канца 16 да сярэдзіны 17 стагоддзяў на Беларусі выйшла 16 буквароў – больш як палавіна падобных выданняў на ўсходнеславянскіх землях.

Першы "Буквар" быўразлічаны не толькі на юнацкую, але і на дарослую аўдыторыю. Па ім сапраўды вучыліся чытаць. Невялікі памер кнігі падкрэслівае, што мы маем справу з першым зручным выданнем для навучання. Пачынаючы з першай публікацыі, амаль два стагоддзі "Буквары" амаль не адрозніваліся адзін ад аднаго ні па дызайну.

Напачатку вучні вывучалі літары славянскага алфавіта, затым складалі іх ў простыя склады і словы. Пасля гэтага яны чыталі словазлучэнні, а потым і цэлыя сказы. Кожны занятак абавязкова пачынаўся з малітвы. Яны складалі істотную частку кнігі — ад трэці да паловы агульнага аб'ёму.

Акрамя гэтага, былі ў кніжцы мудрыя выказванні, пералік наказаў для маладых людзей — "не крадзі", "шануй бацьку свайго і маці" — і пералік смяротных грахоў — "празмерны гонар", "абжорства", "зайдрасць", "сквапнасць", "гнеў" і іншыя.

Самыстаражытны "Буквар" з тых, што захоўваюцца ў Беларусі, выдадзены ў 1767 годзе.

Сімяон Полацкі, які быў настаўнікам царскіх дзяцей, у тым ліку і Пятра І, змясціў у буквары ўласныя вершаваныя настаўленні. Буквар пачынаўся “Прадмовай для юнакоў, якія жадаюць вучыцца”. Менавіта яго Буквар абудзіў цікавасць юнага Пятра да еўрапейскай навукі.

Юнак малады, з маленства вучыся,
Літары ведай, да ведаў імкніся!
Ляноту гані і рупліва працуй,
Праз тое шмат плёну ў жыцці заваюй.
Хоць часам вучыцца бывае нялёгка,
Але плён навукі – які ж ён салодкі!
Той, хто з юнацтва дбайна працуе,
У веку старэчым пра лёс не гаруе.
Самы ж шчаслівы – хто кнігі чытае,
Бо мудрасць продкаў глыбока спазнае. *Пераклад Алеся Сушы*

У царкоўнаславянскай мове многія словы раней пісаліся ў скарочанай форме. Пры гэтым над словам звычайна ставіўся знак (“цітла”). Школьнікі ў XVII ст. павінны былі правільна скарачаць словы. А ты паспрабуй раскрыць іх значэнне.

***Творчая работа***



Адным з самых старых буквароў на Мастоўшчыне з’яўляецца буквар, які знаходзіцца ў нашым школьным музеі. Яму больш за сто гадоў. Ён таксама адрозніваецца ад сучасных буквароў, але ў ім ёсць творы, якія чытаюць дзеці і цяпер.

***Творчая работа. Чытанне верша “Детство”***

***Творчая работа. Абвядзіце літары старарускага алфавіту, якіх няма ў сучасным.***




Адным з найлепшых беларускіх буквароў XX – пачатку XXI ст. лічыцца знакаміты “Буквар” Анатоля Клышкі, які ўпершыню выдадзены ў 1969 г. і перавыдаваўся 23 разы на беларускай, рускай і польскай мовах. Ён атрымаў залаты медаль Міжнароднай лейпцыгскай кніжнай выстаўкі ў 1977 г., а ў 2004 г. прызнаны лепшым падручнікам года на выстаўцы ў Франкфурце-на-Майне.

У экспазіцыі школьнага музея выстаўлены 4 буквары А.Клышкі розных выданняў (2-ое, 5-ае, 6-ае, 8-ае для школ з беларускай мовай навучання).




Беларусы вельмі добра папрацавалі над выданнем буквароў, чым могуць ганарыцца. Нашы аўтары пераймалі лепшае ад еўрапейскіх выданняў такога характару. І зараз нашы дзеткі маюць магчымасць вучыцца грамаце па вельмі якасных падручніках, якія ўзялі пачатак ад створаных нашымі продкамі і пра якія выдатна напісаў Мікола Гусоўскі: “Свет даўніны вывучаў я па кнігах славянскіх, Граматах рускіх, кірыліцай пісаных вязкай. Лад алфавіту наш прашчур для ўласнай карысці

Ў грэкаў пазычыў і, гукі мясцовых гаворак

Зладзіўшы з ім, іншаземцам, застаўся сабою”.

Дадатак 3.

## Незвычайны-звычайны прадмет

Музейны занятак

**Мэта:** удасканаленне сістэмы патрыятычнага выхавання навучэнцаў праз даследванне гісторыі асобных экспанатаў.

### Ход занятка

**Кіраўнік музея**

Музей – установа, якае займаецца збіраннем, вывучэннем, захоўваннем і паказам прадметаў і дакументаў, якія характарызуюць развіццё прыроды і чалавечага грамадства і ўяўляюць гістарычную, навуковую ці мастацкую каштоўнасць.

У музеі захоўваецца вялікая колькасць прадметаў.

- Як называюцца музейныя прадметы? Складзіце слова-назву з прапанаваных літар. ЭКСПАНАТ.
- Паглядзіце уважліва, ці з усімі экспанатамі вы знаёмы? Вядома, не. Таму я прапаную вам пазнаёміцца бліжэй з адным з такіх незнаёмцаў.

Гісторыя знаходкі. (Стэнд “Малая радзіма Пескі”)

Наша зямля захоўвае ў сабе яшчэ вельмі шмат таямніц. Адыходзяць людзі, якія яшчэ памятаюць аб той вайне. У сучаснай дзейнасці музея вялікае значэнне надаецца аўдыё і відэазапісу ўспамінаў дзяцей вайны. Аб ваенным жыцці мястэчка нам расказала Арцісевіч Алена Іванаўна, якой у той час было каля дзесяці год. Яе ўспаміны не звязаны з прадстаўленым экспанатам, але даюць нам уяўленне аб тэрытарыяльным размяшчэнні і магчымасць паразважаць аб тым, як экспанат мог аказацца на беразе Зяльвянкі. Верагодней за ўсё ён быў проста згублены, так як баёў у гэтым месцы не было ні пры акупацыі, ні пры вызваленні.



**Інв. №853 КП-3,**
**Акт прыёма №2 ад 15.02.2019.**
Захаванасць частковая
Знак нямецкі. Спартыўны знак DRL.
Перададзены ў музей Гах Г.Р.

У мінулым навучальным годдзе пошукавая група музея правяла некалькі рэйдаў па аграгарадку Пескі Мастоўскага раёна з мэтай апытвання насельніцтва і магчымым зборы экспанатаў. У гады Вялікай Айчыннай вайны ў мястэчку знаходзілася нямецкая камендатура і турма. А так як большасць жыхароў складалі яўрэі, то ў самым пачатку вайны тут было створана яўрэйскае гета.

Падчас экспедыцыі па вуліцы Лясной,

якая ў тагачасным мястэчку знаходзілася на тэрыторыі гета,  ў фонды музея Галінай Раманаўнай Гах было перададзены некалькі прадметаў: капыл для вырабу абутку, лічыльнікі. Але найбольш цікавым, нават можна сказаць унікальным, аказаўся нагрудны нямецкі знак. Знойдзены ён быў на беразе ракі Зяльвянка, на агародзе пад час ўзгорвання.

Пры дэталёваым даследаванні і вывучэнні інфармацыі аб значнасці знаходкі было выяўлена, што гэта нямецкі спартыўны значок таксама вядомы як “Нямецкі нацыянальны спартыўны значок” .

**АПІСАННЕ ПРАДМЕТА**

Спартыўны кваліфікацыйны знак (Значок) DRL “у бронзе” 3 класа. Германія, перыяд 3 Рэйха. Вытворчы выпуск 1937-1945 гады нямецкай фірмы Германа Верштайна ў горадзе Йена (Германія, зямля Цюрынгія). Размер – 48х39 мм, вага – 16 грамм. Бронза, ліццё, штамп, паліроўка.

Аверс: манаграма вяззю з трох лацінскіх літар нямецкай абрэвіятуры **DRL — Deutsche Reichsbund für Leibesübungen** (Германская Імперская Ліга). Вобад са стылізаваных дубовых лістоў (сімвал пераможцаў), у ніжняў частцы свастыка.

Рэверс: заколка вертыкальная, вытворчая маркіроўка **WERNSTEIN JEMA D.R.G.M. 35269** (ГЕРМАН ВЕРШТАЙН, горад Йена, **Deutsches Reichsgebrauchsmuster**; Нямецкі імперскі зарэгістрыраваны ўзор.





Форма СС 1944 года з нямецкім спартыўным значком;
злева ўнізе – германскія руны майстэрства

**Гістарычная даведка**

Першапачаткова знак быў зацверджаны 21 сакавіка 1913 года па ініцыятыве нямецкай спартыўнай асацыяцыі **Deutschen Reichsausschusses für Olympische Spiele (DRAfOS**; Нямецкі Імперскі камітэт па падрыхтоўцы да Алімпійскіх гульняў) і з’яўляецца адной са старэйшых узнагарод Германіі, якія знаходзяцца і ў сучасным выкарыстанні. Першае ўзнагароджванне адбылося 7 верасня 1913 года, сярод узнагароджанных быў вядомы ініцыятар

Алімпійскага руху ў Германіі і генеральны сакратар аргкамітэта па правядзенні Альмпійскіх гульняў у Берліне 1936 года Карл Дзім (1882-1962 гг.)

Спачатку значок выдаваўся толькі мужчынам за праходжанне разнастайных фізічных тэстаў. У 1921 годзе ён атрымаў назву *Deutsches Turn- und Sportabzeichen*, і жанчыны таксама атрымалі права на ўдзел.

Пасля прыходу да ўлады нацыстаў 24 сакавіка 1933 года мяняецца не толькі абрэвіятура і назва значка **Deutsche Reichsbund für Leibesübungen**; Германская Імперская Ліга фізічных практыкаванняў (5 мая 1933 года), але і сама тэорыя прадназначэння фізічнага выхавання. Дызайн узнагароды застаецца практычна папярэднім, акрамя літар DRA.

У 1937 годзе ў сувязі з прыняццем закона аб рэалізацыі назваў, на медалях і ордэнах Трэцяга Рэйха, на значку з'яўляецца свастыка.

Кваліфікацыйныя знакі **DRL** дзяліліся на тры класы (ступені) у "золаце", "срэбры" і "бронзе".

**Умовы атрымання (нарматыўнае палажэнне на 1937 год)**

Для атрымання 3 ступені ў "бронзе" асобы ад 18 да 32 год павінны былі выканаць пастаўленыя перад імі нарматывы на працягу 1 года адпавядаючыя кваліфікацыйным патрабаванням 3 класа.

Для атрымання 2 ступені ў "срэбры" асобы ад 18 да 32 год павінны былі на працягу 8 гадоў адпавядаць спартыўна-фізічныя патрабаванням 3 класа. Асобам ад 32 да 40 гадоў на працягу 1 года адпавядаць кваліфікацыі спартыўнага патрабавання 2 класа.

Для атрымання 1 ступені ў "золаце" асобы ад 18 да 40 год ( ужо атрымаўшым сярэбраны спартыўны значок) адпавядаць спартыўна-фізічныя патрабаванням на працягу 8 гадоў нормам 2 класа. Асобам старэйшым за 40 гадоў на працягу 1 года адпавядаць кваліфікацыі спартыўнага патрабавання 1 класа.

18 лістапада 1942 года была ўстаноўлена спецыяльная ступень для ваеннаслужачых-інвалідаў. Знак для інвалідаў быў ідэнтычны залатому, але адрозніваўся пасярэбранай манаграмай.

У праграму ўваходзілі такія дысцыпліны як плаванне, спартыўная хадзьба, скачкі ў вышыню і даўжыню, гімнастычныя практыкаванні, лыжныя гонкі па перасечанай мясцовасці, бег на 100 , 400, 1 000 і 10 000 метраў, кіданне дыска, кап'я і мяча, канькабежны спорт, грэбля, цяжкая атлетыка, стральба з малакаліборнай вінтоўкі, стральба з пісталета, марш-кідок, матацыклетныя гонкі па перасечанай мясцовасці.

Безумоўна ў Трэцім Рэйху вялікая ўвага надавалася развіццю фізічнай культуры, яе накіраванасць была вызначаючай на удасканаленне чалавека.

Гэта выпрацоўвала развіццё не толькі фізічных якасцей, як сілавой састаўляючай, але і развіццё сілы волі для ваенных дзеянняў, з мэтай пакарэння народаў і стварэння Сусветнай імперыі. Адольф Гітлер лічыў, што з невялікай колькасцю войск можна перамагчы СССР дзякуючы сіле волі сваіх салдат. І ва многіх аспектах баявых дзеянняў на тэрыторыі СССР гэта праследжваецца. У выніку гэта сіла сутыкнулася з нянавісцю савецкіх салдат, і вынік быў вызначаны і прадбачаны.

Як відаць з вышэй апісанага атрымаць значок нават 3 ступені было даволі складана. Нельга сказаць, што значок быў вялікай рэдкасцю сярод нямецкіх салдат, але ў экспазіцыі школьных музеяў ён трапляе не так часта. У нашым музеі значок знаходзіцца ў экспазіцыі “Маўклівыя сведкі вайны” побач з нямецкім кацялком і каскамі. Пад час аднайменнай экскурсіі экскурсаводы абавязкова звяртаюць увагу наведвальнікаў на такі рэдкі музейны прадмет. Як экспанат значок выкарыстоўваецца пры перасоўнай экскурсіі “Музей у чамадане”, а таксама на ўроках і факультатыўных занятках па гісторыі.

Сучасны музей - не толькі месца размяшчэння прадметаў, гэта месца захавання гістарычнай памяці. І задача кожнага з тых, хто звязаў свае веды і час з музеем, данесці гэтыя веды да кожнага наведвальніка: і дарослага і малога.

**Інтэрактыўная гульня**

- Каб атрымаць значок, вы чулі, трэба выканаць вялікую колькасць нарматываў. Я прапаную вам самае простае: хто зможа 2 хвіліны прастаяць на адной назе.

Вынік урока.

- З якім музейным незнаёмцам мы пазнаёміліся сягодня?
- У якім годзе быў выпушчаны такі знак?
- Хто меў права яго атрымаць?
- Ці маглі жанчыны атрымліваць такі значок?

Дадатак 4.

# ПАЗНАЙ СВОЙ КРАЙ
## (Экскурсійны квэст па аграгарадку Пескі)

## I. УВОДЗІНЫ

Экскурсія пабудавана ў форме гульні – квэста (прыгодніцкай гульні (ад англ. quest – пошукі) – аднаго з асноўных жанраў гульняў, якія патрабуюць рашэння разумовых задач для руху па маршруце). Такая форма мерапрыемства садзейнічае фарміраванню шэрагу кампетэнцый: навучальна-пазнавальнай, інфармацыйнай, інтэлектуальнай, камунікатыўнай.

Праводзіцца квэст-гульня ў шосты школьны дзень, калі у школе ёсць магчымасць задзейнічаць вялікую колькасць навучэнцаў. За некалькі дзен да гульні вучням прапануецца выбраць капітана, прыдумаць назву, эмблему, дэвіз. Капітан адказвае за маршрут, атрымлівае літару у выпадку правільнага адказу.

## II. ПРАВІЛЫ ГУЛЬНІ

У вызначаны час каманды збіраюцца на пляцоўцы перад школай, прадстаўляюць сябе. Настаўнік – арганізатар аб’яўляе мэту і правілы гульні: кожная каманда атрымае маршрутны ліст з пералікам прыпынкаў, якія яна павінна знайсці ў мястэчку. На кожным прыпынку трэба выканаць заданні (колькасць часу абмежавана – 3 хвіліны), за правільна выкананыя заданні каманда атрымлівае літару і рухаецца далей па маршруце. Перамагае тая каманда, якая першая вернецца на старт, складзе літары і назаве слова.

На кожным прыпынку (іх пяць, пры жаданні колькасць прыпынкаў можа павялічвацца і адпаведна мяняцца зашыфраванае слова), гульцоў чакаюць асістэнты (настаўнікі, вучні старэйшых класаў), якія даюць заданне, сочаць за часам (3-4 хвіліны), правяраюць правільнасць выканання. За правільна выкананае заданне асістэнт дае камандзе літару.

Час паравядзення гульні – 1 гадзіна. Колькасць літар у слове супадае з колькасцю прапанаваных аб’ектаў.

На кожным прыпынку – толькі адна літара.

Удзельнікі гульні – вучні 6 і 7 кл., 5 чалавек ад кожнага класа, павінна быць назва каманды, капітан.

Кожная каманда для суправаджэння па маршруту мае дарослага кіраўніка. У нашым выпадку – класны кіраўнік 7 класа суправаджае шасцікласнікаў і адпаведна класны кіраўнік шостага класа – сямікласнікаў.

## III. МЭТА І ЗАДАЧЫ ГУЛЬНІ

**Мэты:** Паглыбленне ведаў вучняў па гістарычным мінулым свайго аграгарадка.

**Задачы:**

Развіваць пазнавальную цікавасць школьнікаў, крэатыўнае мысленне;

Павышанне імкненне да самаадукацыі, асобаснаму росту;

Фарміраваць ўменне працаваць у камандзе, дасягаць кампраміса;

Развіваць камунікатыўныя навыкі, выхоўваць культуру зносін.

## IV. ХОД ГУЛЬНІ

1 Прывітанне каманд.

2 Аб’яўленне мэты гульні, правілаў:

Перад вамі выявы будынкаў і гістарычна-знакамітых месцаў былога мястэчка Пескі. Прайдзіце маршрутам, які іх злучае, знайдзіце месцы, дзе гэтыя аб’екты знаходзіліся раней. На кожным прыпанку патрэбна расказаць аб тых аб’ектах, якія тут былі раней і іх ролі ў жыцці мястэчка.

**Абсталяванне:**

1. Маршрутныя лісты

Маршрут 1.

Вуліца Школьная – перавулак Мельнічны – вуліца 50 год БССР – вуліца Лясная

Маршрут 2.

Вуліца Лясная – вуліца 50 год БССР – перавулак Мельнічны – вуліца Школьная

2. Канверты з выявамі аб’ектаў (для ўдзельнікаў гульні)

3. Канверты з заданнямі (у асістэнтаў)

4. Наборы літар. П Е С К І

**1. Прыдарожны крыж.**




Кароткія звесткі аб аб’екце (інфармацыя для асістэнтаў)

Крыж пастаўлены ў гонар невядомага польскага салдата, які загінуў у гады Першай сусветнай вайны. Па форме нагадвае польскі ордэн. З 1934 па 1939 год вучні мясцовай школы і навакольных вёсак штогод 3 мая ўскладалі да яго кветкі ў памяць аб героях вайны. Калісьці стаяла два такія крыжы. Захаваўся толькі адзін, які размяшчаецца пры ўездзе ў вёску з боку в. Ляда.

**Заданні:**

1. Калі адбылася Першая сусветная вайна. (У 1914 годзе)

2. Дзе яшчэ ў Песках ёсць помнік салдатам Першай сусветнай вайны. (На прыкасцельнай тэрыторыі)

3. Адзін з помнікаў той вайны знаходзіцца на праваслаўных могілках. Каму ён пастаўлены? (Помнік нямецкім салдатам, якія загінулі ў Першую сусветную вайну)

**2. Вадзяны млын**

У канцы 19-га стагоддзя ў вёсцы працавалі два млыны: драўляны і мураваны.

Ніхто не памятае калі быў пабудаваны, але вядома імя гаспадара – Францішак Бубновіч. Яго нашчадкі валодалі млыном да 1939 годы. У 60-ыя гады 20 стагоддзя драўляны млын згарэў у час навальніцы, праз два гады ён быў адноўлены. У жніўні 2010 года млын быў разбураны зруйнаваны, толькі жорны,скінутыя ў ваду нагадваюць аб яго існаванні.





**Заданні:**

1. Чаму месца, дзе стаяў млын называюць Перакопам? (Тут была перакапана дарога і пракладзена штучнае русра ракі Зяльвянка)
2. Які аб’ект знаходзіўся побач з млыном пад асфальтаванай дарогай? (Драўляны мост).
3. Чаму млын быў пабудаваны так блізка да праезжай часткі? (Для зручнасці пад’езду)

**3. Амбулаторыя**





У даваенным мястэчку ў гэтым будынку размяшчалася Пескаўская гміна. У гады вайны немцы дабудавалі другі паверх і размясцілі тут камендатуру. За будынкам камендатуры знаходзілася невялікае памяшканне абсталяванае пад турму. Пасля вызвалення будынак выкарыстоўваўся ў самых мірных мэтах. Тут знаходзілася ўчастковая амбулаторыя. У 2017 годзе будынак знесены.

**Заданні:**

1. Назавіце кабінеты, якія былі ў амбулаторыі.
2. Як называецца дрэва, якое захавала памяць аб будынку амбулаторыі?
3. У якім годзе ў амбулаторыі быў дабудаваны другі паверх?

**4. Аптэка**

Адзін з нямногіх даваенных будынкаў, які захаваўся ў мястэчку Пескі з тых часоў, калі палова насельніцтва ў ім былі яўрэі.

Будынак гэты за гады свайго існавання не мяняў свайго прызначэння. І да вайны, і пасля яе тут размяшчалася аптэка. У 2020 годзе аптэка была зачынена і перанесена ў іншае месца. Што будзе з будынкам далей пакуль што невядома. Спадзяемся, што яго не спасцігне лёс яго суседзяў.





**Заданні:**

1. Як фармулюецца дзейнасць аптэкі? (“Аказанне фармацэўтычнай дапамогі насельніцтву”)
2. У якім будынку знаходзіцца зараз Пескаўская аптэка? (У будынку Пескаўскай амбулаторыі)
3. У 2022 годзе дадзенаму будынку споўнілася 87 гадоў. У якім годзе ён быў пабудаваны? (У 1935 годзе).

**5. Сінагога**





Сінагога ў в.Пескі была адной з найпрыгажэйшых у былым Ваўкавыскім павеце. Гэта быў драўняны будынак сярэдзіны XVIII стагоддзя. З захаду ад уваходу ў галоўную залу знаходзіліся аднапавярховыя сенцы. З паўночна-заходняга і паўднёва-заходняга вонкавых бакоў – аднапавярховыя вежы. Свае ўражанні пра пескаўскую сінагогу пакінула Марыя Прушыньска з Рагозніцы: “Былі там вазы з Дэльф і падсвечнікі хіба сямнаццатага стагоддзя”.

Сінагога згарэла ў 1944 годдзе.

**Заданні:**

1. Побач з сінагогай знаходзіўся аб’ект, які існуе і цяпер. Што гэта? (Калодзеж)
2. У гады Вялікай Айчыннай вайны сінагога знаходзілася на тэрыторыі чаго? (Пескаўскага гета).
3. Што такое сінагога? (Яўрэйскі малільны дом)

Дадатак 5.

**Інтэрактыўны занятак**

**“Як хлеб прыйшоў на стол”**

**Мэта:** садзейнічаць фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці.

**Задачы:**

- пашырыць веды аб мясцовасці, дзе яны нарадзіліся і жывуць;
- вызначыць адметнасць і самабытнасць культурнага асяроддзя, што іх акружае;
- паказаць значнасць яго для нацыянальнай і агульначалавечнай культуры;
- стварыць умовы для выхавання адказнасці за захаванне гісторыка-этнаграфічнай спадчыны.

**Кіраўнік музея**

-Добры дзень. Сягодня я не проста Рэгіна Станіславаўна, кіраўнік школьнага музея, я сягодня бабуля Рэгіна да якой на канікулы сабраліся яе ўнукі. Перш чым запрасіць вас у сваю хату, адгадайце загадку: “Калі галодная, стаю халодная, а як наетая – хата сагрэтая”. Гэта печ. Менавіта аб ёй і пойдзе ў нас гутарка.

**Міні-экскурсія**

Галоўнае месца ў хаце займае **печ.** Ад месцазнаходжання печы залежаў увесь хатні інтэр’ер. Стаіць яна ў левым вугле насупраць увахода. Печ ацяпляла жыллё, у ёй рыхтавалі ежу, грэліся, сушылі вопратку. Ёй прыпісвалі ачышчальныя і ахоўныя якасці.

У “бабіным куце”, насупраць печы, знаходзяцца асноўныя кухонныя прылады. Тут гаспадыня рыхтавала ежу. На адкрытых паліцах – **посуд: гліняныя збанкі, кубкі, місачкі**, якімі карысталася гаспадыня кожны дзень. У кутку знаходзяцца вагі, каромысел, начоўкі.

Побач з прасам у хаце размяшчалася **качалка**, ім прасавалі пасцельную бялізну.

Каля печы знаходзіцца **качарэжнік** (кут паміж печчу і дзвярыма), дзе састаўлены пячны інвентар – **качарга, вілкі, чапяла, венік** з бярозавых галінак.

Каля качарэжніка знаходзіцца самаробная **вешалка для ручнікоў**. Гаспадыня вешала некалькі ручнікоў для абіходу: для рук, для твару, для выцірання посуду. Гэта былі ручнікі якімі карысталіся кожны дзень. “Рушнікі ў нас на Беларусі таксама розныя і дужа разнастайныя. Узоры іншыя, чым ў суседзяў, хаця ёсць і падобныя. Галоўная розніца – менш “раслін і кветак”. Арнамент часцей геаметрычны. Меней чорнага колеру. Пераважае “вясёлка”, жоўты, чырвоны, сіні, блакітны і іншыя колеры.”, - пісаў Уладзімір Караткевіч

**Гульні**

- Запрашаю вас прыняць удзел у гульні **“ ГАРАЧЫЯ ГАРШЧОЧКІ”.** Слухайце ўважліва :

На стульчыках стаяць гаршчочкі, вісяць анучкі ( ручнічкі). Узяўшы анучкай гаршчочак з стра-вай патрэбна аднесці яго на стульчык насупраць каманды, што стаіць на адлегласці. Прыбегшы з анучкай, гулец перадае яе наступнаму гульцу з кананды, які з анучкай бяжыць за гаршчочкам і прыносіць яго назад. Перамагае тая каманда, якая раней закончыць гульню.

**“ ЛЯВОНЫ”.**

- Лета... Якая цудоўная пара! Які спякотны сёння дзень. Для беларуса ў такую спякоту найлепшым ратункам ад сонца быў саламяны капялюшык. Я апранаю капялюшык двум гульцам. Яны выходзяць на сярэдзіну сцэны і ў руцэ трымаюць пугу. Стаўшы адзін супраць аднаго, руку з пугай трымаюць за спінаю. Стоячы на адной назе стараюцца зняць з суперніка шляпу. Перамагае тая каманда, гульцы якой большую колькасць разоў знялі капялюш з галавы суперніка.

**“ БУЛЬБА”.**

Бульба рассыпана насупраць кожнай каманды. Яе колькасць адпавядае колькасці гуляючых.

Трэба па камандзе з завязанымі вачыма знайсці адну бульбіну, пакласці яе у кошычак і пры-бегчы да каманды, перадаўшы кошычак з бульбай наступнаму іграку. Гульня заканчваецца, калі адна з каманд хутчэй збярэ ў кошычак усю бульбу.

**“ ЗАЧЭП”.**

Мы правядзем конкурс на самага дужага гледача. Для гульні патрэбны стол. Вось ён, перад вамі. Я запрашаю для пачатку двух гульцоў. Яны садзяцца адзін насупраць другога. Фалангамі сярэдніх пальцаў правай (левай) рукі імкнуцца перацягнуць партнёра. Другой рукой яны ўпіраюцца ў стол. Прайграе той, хто першы разагне палец. Потым з залы запрашаецца яшчэ адзін ахвотны, яшчэ і яшчэ.

Хто аказваецца найдужэйшы, аб’яўляецца асілкам. Яму ўручаецца падарунак ад бабкі Рэгіны.

**СМАЧНЫ**

У вас на картках запісаны назвы беларускіх народных страў і словы “самазванцы”. Давайце паспрабуем падрыхтаваць абед. Падкрэсліце беларускія стравы.

***Жур,*** магерка***, поліўка, мачанка,*** конаўка***,***
***верашчака,*** брында***, хрусты,*** панёва***, глазуха,*** мянташка***, локшыны, ламанцы,*** мачыльня***, налиснікі,*** абліваха***, панцак, калдуны,*** жырандоль***, капытка,*** жлукта***, узвар, збінец,*** гэбель***. (Вылучаныя — стравы).***

**Гульня “Нараджэнне хлеба”**

(Карткі са сказамі, патрэбна адрадзіць шлях хлеба. Кожная каманда раскладае карткі ў парадку нараджэння хлеба). Пасеяць зерне. Трэба

падкарміць зямлю ўгнаеннямі. Правесці барацьбу з пустазеллем. Каласкі зжаць і абмалаціць. Зерне правеяць, адвезці на млын. Муку адвезці на хлебазавод. Замясіць цеста. Спячы хлеб. Гатовы хлеб палажыць у кантэйнеры і даставіць у магазін.

Ну вось, дарагія мае, мы наведалі сягодня бабулін кут. А скажыце мне, ці быў у беларускай хаце дзедаў кут? Не. Дзедавы прылады працы захоўваліся ў сенях ці гумне. Туды я запрашу вас ў наступны раз.

Картка 1.

Жур, магерка, поліўка, мачанка, конаўка,
верашчака, брында, хрусты, панёва, глазуха, мянташка, локшыны, ламанцы, мачыльня, наліснікі, абліваха, панцак, калдуны, жырандоль, капытка, жлукта, узвар, збінец, гэбель.

Картка 2.

Пасеяць зерне.
Трэба падкарміць зямлю ўгнаеннямі.
Правесці барацьбу з пустазеллем.
Каласкі зжаць і абмалаціць.
Зерне правеяць, адвезці на млын.
Муку адвезці на хлебазавод.
Замясіць цеста.
Спячы хлеб.
Гатовы хлеб палажыць на стол.

**Субота ў стылі рэтра**
Праект школьнага шостага дня

Саставілі:
Вялічка Рэгіна Станіславаўна
Рагацэвіч Тамара Раманаўна

Адказны за выпуск *Г.Р.Гах*
Камп'ютэрная вёрстка *А.П. Шкуда*

**Дзяржаўная установа адукацыі**
«Пескаўская сярэдняя школа Мастоўскага раёна»
231621 Гродзенская вобласць
Мастоўскі раён
аграгарадок Пескі
вуліца Школьная,3
Тэл.: 3-73-86
E-mail: peskischool3@gmail.com